**УДК 94(476)**

# РАЗВІЦЦЁ РАМЯСТВА І РАМЕСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1921 – 1939 ГАДАХ

***Л.В. ЛАЎРЭНКА***
***(Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)***

*На аснове розных гістарычных крыніц даецца характарыстыка заходнебеларускаму рамяству і рамеснай вытворчасці ў 1921 – 1939 гадах. Робіцца аналіз заканадаўчай базы 1920 – 1930-х гадоў у сферы рамяства. Разглядаюцца заканадаўчыя акты, якія адлюстроўваюць асноўныя аспекты дзейнасці рамяства і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях. Падрабязна апісваюцца ўмовы для вядзення рамяства і рамеснай вытворчасці ў Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гадах. Характарызуюцца найбольш развітыя на тэрыторыі Заходняй Беларусі рамесніцкія спецыяльнасці. Адзначаецца, што ў даследуемы перыяд рамяства на тэрыторыі Заходняй Беларусі развівалася даволі слаба, а большасць рамесных вырабаў ішлі пераважна на мясцовы рынак.*

**Уводзіны.** Гісторыя эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гады ў наш час патрабуе аб'ектыўнага навуковага вывучэння і асэнсавання сучаснымі айчыннымі навукоўцамі. Існуючая навуковая літаратура, якая закранала тыя ці іншыя аспекты эканамічнай гісторыі заходнебеларускіх земляў, прадстаўлена галоўным чынам эканамічнымі і гістарычнымі артыкуламі ў навуковых перыядычных выданнях і матэрыялах навуковых канферэнцый. Аднак комплексных прац па эканамічным развіцці Заходняй Беларусі ў перыяд яе ўваходжання ў склад Польскай дзяржавы няма. У сувязі з гэтым вывучэнне рамеснай вытворчасці як састаўной часткі эканамічнага развіцця заходнебеларускіх земляў з'яўляецца актуальным для сучаснай гістарычнай навукі.

Сярод айчынных даследаванняў, якія прысвечаны вывучэнню асобных аспектаў развіцця рамяства і рамеснай вытворчасці, неабходна адзначыць працу В.А. Лабачэўскай [1], у якой асобны раздзел прысвечаны народным промыслам Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гадах. У манаграфіі на аснове шматлікіх польскіх крыніц і архіўных матэрыялаў даецца характарыстыка агульнага стану заходнебеларускіх народных промыслаў і рамёстваў. Асобныя звесткі аб рамястве і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях змяшчаюцца ў артыкуле Г. Каспяровіча і В. Каспяровіч [2]. Польскія аўтары пачалі вывучэнне праблем развіцця народных промыслаў і рамёстваў на тэрыторыі Заходняй Беларусі яшчэ ў 1930-я гады. Першай сярод іх была Я. Арынжына [3 – 5], якая ў перыяд з 1920 па 1939 год з'ўлялася супрацоўнікам аддзела народных мастацкіх промыслаў Міністэрства прамысловасці і гандлю Польшчы. У сваіх працах аўтар апісвала асноўныя віды народных промыслаў заходнебеларускіх зямель, прыводзіла статыстычныя дадзеныя па паветах. Асобнаму віду рамяства – кавальству – прысвечана манаграфія Я. Карыбуцяка [6]. У ёй разглядаецца гісторыя развіцця кавальскага рамяства, асартымент яго вырабаў на тэрыторыі Віленскага ваяводства. Змены, якія адбываліся ў сельскіх народных промыслах і рамёствах, пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя, апісаны ў працы Л. Туркоўскага [7]. Частка падрыхтаваных ім у 1930-я гады прац пра рамёствы і промыслы Заходняй Беларусі выйшла толькі ў пасляваенны час [8; 9]. Даследаванне І. Барнштэйна [10] прысвечана гісторыі развіцця яўрэйскага рамяства на тэрыторыі Польшчы пачынаючы з 1914 года. Звесткі аб розных відах рамёстваў змяшчаюцца і ў працах В. Дыноўскага, Х. Тшэбінскай-Бадзінскай і С. Галасіевіча [11 – 13].

Улічваючы слабую распрацаванасць тэмы развіцця рамяства і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях у 1921 – 1939 гадах, была пастаўлена наступная мэта – даследаваць стан рамяства і яго развіццё на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гадах. Для дасягнення пастаўленай мэты былі вылучаны наступныя задачы: 1) даць характарыстыку заканадаўчай базы, якая рэгулявала дзейнасць рамяства на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Польшчы ў цэлым; 2) правесці аналіз развіцця рамяства і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях. Для раскрыцця пастаўленай мэты выкарыстоўваліся шматлікія польскія крыніцы, а таксама матэрыялы Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці.

**Асноўная частка**

**Прававыя асновы рамяства і рамеснай вытворчасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі.** У 1920 – 1930-я гады Польшча была адзінай еўрапейскай дзяржавай, якая мела досыць распрацаваную заканадаўчую базу, накіраваную на рэгуляванне рамяства і рамеснай вытворчасці. Асноўным дакументам, які вызначаў прававое палажэнне рамёстваў у Польшчы і Заходняй Беларусі, было «Прамысловае права» ад 16 снежня 1927 года, выдадзенае на аснове Распараджэння Прэзідэнта Польшчы «Аб прамысловым праве» ад 7 чэрвеня 1927 года [14]. Гэта першы нарматыўны акт, які рэгуляваў пытанні дзейнасці рамяства ў Польшчы пасля здабыцця ёю незалежнасці. Да гэтага часу на тэрыторыі Польшчы, у першую чаргу на тэрыторыях, якія знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі, Аўстра-Венгрыі і Прусіі, існавалі розныя прававыя сістэмы, у тым ліку і ў сферы рамяства, што ўскладняла ажыццяўленне кіраўніцтва дзей-

насцю рамеснікаў і кантроль над рамеснай вытворчасцю. Закон аб прамысловым праве на заканадаўчым узроўні рэгуляваў адносіны польскай дзяржавы да рамяства і рамеснай вытворчасці ў цэлым. Закон вызначаў рамесніцкія спецыяльнасці, якія падпадалі пад яго юрысдыкцыю. Дзякуючы закону на дзяржаўным узроўні была наладжана арганізацыя навучання практычна па ўсіх відах рамяства, якое заканчвалася абавязковай здачай кваліфікацыйнага іспыту. Законам былі закладзены і прававыя асновы для разгортвання дзейнасці рамесных цэхаў, адной з асноўных задач якіх з'яўлялася падтрымка тэхнічнага і эканамічнага развіцця рамяства, а таксама абарона інтарэсаў саміх рамеснікаў. Закон аб прамысловым праве прадугледжваў і стварэнне г. зв. інстытута «эканамічнага самаўпраўлення» – рамесніцкіх палат, асноўнай мэтай якіх было прадстаўленне прафесійных інтарэсаў рамяства (арт. 168 прамысловага права). У цэлым па Польшчы ў той час налічвалася 17 рамесніцкіх палат, а на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі ўтвораны 4: Віленская, Навагрудская, Брэсцкая і Беластоцкая [15, с. 40, 42]. Тэрыторыі, на якія распаўсюджвалася сфера іх уплыву, супадалі з адміністрацыйнымі межамі ваяводстваў. Асноўнымі задачамі рамесніцкіх палат былі ўзаемадзеянне з дзяржаўнай уладай па падтрымцы рамяства праз прадстаўленне інфармацыі і водгукаў; прадстаўленне ўладам пажаданняў і прапаноў, якія датычыліся інтарэсаў рамяства, а таксама штогадовай справаздачы аб стане рамяства на падуладнай ёй тэрыторыі; рэгуляванне спраў навучання рамяству; стварэнне экзаменацыйных камісій і інш. [14, с. 716]. Дзейнасць палат рэгулявалася міністрам прамысловасці і гандлю. Для кожнай з палат выдаваўся асобны статут. 10 сакавіка 1934 года ў Распараджэнне прэзідэнта Польшчы ад 7 чэрвеня 1927 года «Аб прамысловым праве» былі ўнесены змены, якія закраналі розначытанні некаторых артыкулаў [16].

Распараджэннем міністра прамысловасці і гандлю «Аб дапаўненні спіса рамёстваў, якія змяшчаюцца ў прамысловым праве» ад 21 сакавіка 1933 года [17] і Распараджэннем «Аб дапаўненні спіса рамёстваў» ад 23 чэрвеня 1936 года [18] быў пашыраны пералік рамёстваў, якія падпадалі пад юрысдыкцыю Закона «Аб прамысловым праве». Зменена тэрміналогія ў адносінах да асобных рамёстваў.

20 лютага 1936 года выйшла Распараджэнне міністра прамысловасці і гандлю «Аб рамесных цэхах» [19], якое істотна дапоўніла артыкулы 69 – 99, 160 – 167 Закона «Аб прамысловым праве». Дадзенае распараджэнне даволі падрабязна вызначала задачы, функцыі і кірункі працы цэхаў, іх органы кіравання, а таксама прапісвала склад і функцыі цэхаў.

27 кастрычніка 1933 года быў выдадзены Закон «Аб рамесніцкіх палатах і іх аб'яднаннях» [20]. Дадзены закон вызначаў рамесніцкую палату як пастаяннага прадстаўніка эканамічных і прафесійных інтарэсаў рамяства, як установу эканамічнага самакіравання і суб'ект публічнага права. У ім вызначаліся мэты, задачы, склад палаты і выбары ў яе. Закон вызначаў стварэнне арганізацыі пад назвай «Аб'яднанне рамесніцкіх палат Польшчы» з цэнтрам у Варшаве. Згодна з законам дадзенае аб'яднанне з'яўлялася юрыдычнай асобай, мела публічнае права, магло набываць і прадаваць рухомую і нерухомую маёмасць і г.д. У дакуменце былі адзначаны таксама асноўныя задачы дадзенага аб'яднання, выбары ў склад яго кіраўніцтва.

Яшчэ адным прававым актам, што рэгуляваў дзейнасць рамесніцкіх палат, было Распараджэнне міністра прамысловасці і гандлю «Аб становішчы аб выбарах у рамесніцкія палаты» ад 16 лютага 1934 года [21], якое пашырыла палажэнні артыкулаў 5 – 12 Закона «Аб рамесніцкіх палатах і іх аб'яднаннях» ад 27 кастрычніка 1933 года і артыкулаў 174 – 181 Закона «Аб прамысловым праве».

**Рамяство і рамесніцкая вытворчасць на заходнебеларускіх землях.** На тэрыторыі Заходняй Беларусі рамяство было прадстаўлена невялікімі рамеснымі майстэрнямі, а рамеснікі складалі нешматлікую частку насельніцтва заходнебеларускіх зямель. Усе рамесніцкія спецыяльнасці былі аб'яднаны ў 7 груп – будаўніцтва, апрацоўка дрэва, тэкстыльная, апрацоўка металу, спажывецкая, апрацоўка скуры, сфера паслуг. Найбольш распаўсюджанымі рамесніцкімі спецыяльнасцямі на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі муляры, маляры, шкляры, печнікі, каменяцёсы, сталяры, цесляры, стэльмахі, токары, бондары, краўцы, майстры па вырабу шапак, кушнеры, майстры па вырабу капелюшоў, майстры па вырабу вяроўкі, кавалі, слесары, бляхары, гадзіннікавыя майстры, мяснікі, пекары, каўбаснікі, кандытары, шаўцы, нарыхтоўшчыкі (шаўцы), шорнікі, гарбары, пераплётчыкі, цырульнікі, фатографы.

Згодна з артыкулам 144 прамысловага права: «хто пачынае самастойнае правядзенне рамяства, павінен адначасова з заявай паказаць прамысловай уладзе і інстанцыі, што мае прафесійныя здольнасці для правядзення дадзенага рамяства» [14, с. 713]. Гэты артыкул у дапаўненні да распараджэння прэзідэнта Польшчы 1934 года атрымаў некаторыя змены: «Ажыццяўляць рамесную вытворчасць можна толькі пасля атрымання ад прамысловай улады і інстанцыі рамеснай карты, выдадзенай пасля доказу перад гэтай уладай валодання прафесійнымі здольнасцямі для правядзення дадзенага рамяства» [16, с. 690]. Такім чынам, для самастойнага вядзення рамяства неабходна было атрымаць рамесную карту. Акрамя атрымання рамеснай карты, яшчэ адной умовай для вядзення рамяства было пацвярджэнне прафесійных здольнасцей. Рамеснік, які не мог даказаць прафесійныя здольнасці, неабходныя для вядзення таго ці іншага рамяства, але пры гэтым займаўся рамяством, з'яўляўся «нелегальным», ці г. зв. партачом, з якім вялі барацьбу ўлады і арганізацыі цэхавых рамесніцкіх майстроў.

Прадстаўленне доказу наяўнасці неабходных прафесійных здольнасцей патрабавалася не толькі ад новых кандыдатаў у рамеснікі, але і ад тых, хто займаўся рамяством шмат гадоў. Паводле артыкула 198

Закона аб прамысловым праве фармальна доказам валодання такімі здольнасцямі і ўменнямі магло лічыцца пасведчанне магістрата або гмінннага праўлення, якое пацвярджала, што дадзеная асоба непасрэдна перад абвяшчэннем закона працавала на працягу 5 гадоў у рамесніка, які самастойна займаўся рамяством. Такая практыка пацвярджэння здольнасцей была характэрнай і для ўсіх заходнебеларускіх ваяводстваў [14, с. 719 – 720]. Калі заявіцелем былі прадстаўлены ўсе неабходныя доказы, прадугледжаныя артыкулам 145, прамысловая ўлада першай інстанцыі павінна была на працягу 30 дзён з моманту падачы заявы выдаць рамесную карту (арт. 147).

Паводле дадзеных справаздачы Беластоцкай рамесніцкай палаты за 1930 год на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства налічвалася 17459 рамесных майстэрань, з якіх 1307 прыходзілася на спецыяльнасці будаўнічай групы, 2237 – апрацоўкі дрэва, 3977 – тэкстыльных, 2596 – апрацоўкі металу, 2775 – спажывецкіх, 3829 – апрацоўкі скуры, 738 – сферы паслуг [22, с. 24 – 25]. На тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1933 годзе колькасць рамесных майстэрань дасягнула 9962 [15, с. 35; 23, арк. 6зв.], на будаўнічую групу з іх прыходзілася 655 майстэрань, апрацоўкі дрэва – 2078, тэкстыльную – 1835, апрацоўкі металу – 1646, спажывецкую – 1375, апрацоўкі скуры – 2057, сферы паслуг – 316 [23, арк. 6зв.]. У Навагрудскім ваяводстве налічвалася 7926 майстэрань і адпаведна на будаўнічую групу прыходзілася 547 майстэрань, апрацоўкі дрэва – 828, тэкстыльную – 1930, апрацоўкі металу – 1414, спажывецкую – 1135, апрацоўкі скуры – 1798, сферы паслуг – 274 [15, с. 35]. У Віленскім ваяводстве размяшчалася 12930 рамесных майстэрань, з якіх 1121 прыходзілася на спецыяльнасці будаўнічай групы, 1202 – апрацоўкі дрэва, 2931 – тэкстыльных, 2069 – апрацоўкі металу, 2091 – спажывецкіх, 2944 – апрацоўкі скуры, 572 – сферы паслуг [15, с. 35]. Прыведзеныя дадзеныя сведчаць, што найбольшая колькасць майстэрняў знаходзілася на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства, а найменшая – на тэрыторыі Навагрудскага. Аднак названыя звесткі нельга лічыць дакладнымі з-за цяжкасцей вызначэння колькаснага стану рамяства ў Заходняй Беларусі і ў Польшчы ў цэлым. Напрыклад, недахоп выразнай мяжы паміж рамяством і прамысловасцю паказвае, што гэтая галіна эканамічнага жыцця не магла быць ахоплена ў сукупнасці афіцыйнай статыстыкай. А недакладнасць і вялікая разбежка паміж афіцыйнымі статыстычнымі звесткамі і фактычным станам перш за ўсё звязана з тым, што ў афіцыйныя дадзеныя ўключалі толькі тых рамеснікаў, якія мелі рамесныя карты. Акрамя таго, колькасць знятых з рэестра рамесных карт не адпавядала фактычнай колькасці ліквідаваных прадпрыемстваў. Прычына гэтага заключалася ў тым, што не ўсе ўладальнікі карт вярталі яе пасля спынення самастойнага вядзення рамяства. Так, напрыклад, у Столінскім павеце Палескага ваяводства ў 1929 годзе было зарэгістравана 1160 рамеснікаў, якія мелі рамесныя карты [24, арк. арк. 9 – 9зв.] і 117 рамеснікаў, якія не мелі карт у 1930 годзе [25, арк. 8зв., 9, 11зв.], у Лунінецкім – 474 і 224 адпаведна [24, арк. 10, 11; 25, арк. 2зв., 3, 3зв., 4, 4зв.] і Камень-Кашырскім – 167 і 145 [24, арк. 8, 8зв.; 25, арк. 2, 2зв., 10].

Атрыманне рамеснай карты было вельмі маруднай справай, якая патрабавала шмат часу для збору ўсіх неабходных дакументаў і вялікіх фінансавых затрат. Каб атрымаць карту, неабходна было мець польскае грамадзянства, дыплом аб здачы экзамена па адпаведнай спецыяльнасці, а таксама аплаціць рамесную карту. Сама працэдура атрымання рамеснай карты была наступнай: рамеснік звяртаўся да павятовага старасты з прашэннем аб дазволе атрымаць карту і прадстаўляў усе неабходныя дакументы. Потым павятовы стараста накіроўваў дакументы ў рамесніцкую палату, якая на аснове прадстаўленых матэрыялаў вырашала пытанне аб выдачы рамеснай карты.

Часцей за ўсё рамеснікі не маглі прадставіць неабходныя дакументы на вядзенне рамяства, таму вымушаны былі звяртацца з просьбамі да павятовых стараст. Так, напрыклад, жыхар Косіцкай гміны Брэсцкага павета Зыгмунт Котшыцкі ў 1934 годзе звяртаўся з паданнем да палескага ваяводы. У ім ґаварылася аб тым, што рамяством муляра ён займаўся даўно. Да першай сусветнай вайны працаваў у бацькі спачатку ў якасці вучня, а потым і чаляднікa. Аднак падчас вайны бацька загінуў і не пакінуў ніводнага дакумента, які мог бы пацвердзіць яго прафесійныя здольнасці ў дадзеным рамястве. Таму ён звяртаўся да ваяводы з просьбай дазволіць яму вытрымаць неабходны іспыт пры рамесніцкай палаце. Да свайго прашэння ён прыклаў сведчанні інжынера І. Масталанскага і архітэктара В. Новака, у якіх яны пацвярджалі яго прафесійныя здольнасці. На аснове артыкула 146 прамысловага права Брэсцкая рамесніцкая палата вызваліла Зыгмунта Котшыцкага ад неабходнасці іспыту [26, арк. 12, 16]. Аднак такія выпадкі былі адзінкавыя. Вельмі часта рамеснікі звярталіся з прашэннямі вызваліць іх ад кваліфікацыйных іспытаў. Асноўнымі прычынамі называліся непісьменнасць і цяжкае матэрыяльнае становішча: не ўсе рамеснікі маглі заплаціць за экзамен пошліну ў памеры 40 злотых [26, арк. 106; 27, арк. 114; 28, арк. 42, 42зв., 61]. Былі выпадкі, калі рамеснікам адмаўлялі ў выдачы рамеснай карты па прычыне іх маладога ўзросту: напрыклад, у рамеснай карце было адмоўлена краўцам Гершону Векслеру і Абраму Владаўскаму, жыхарам Брэста [27, арк. 10зв., 74зв.], шаўцу Боруху Юлевічу, жыхару в. Лахва Лунінецкага павета [28, арк. 33].

Асобнае месца ў заходнебеларускім рамястве займалі яўрэі, якія складалі 73 % ад агульнай колькасці рамеснікаў ва ўсёй Польшчы [10, с. 47]. Аб гэтым сведчаць дадзеныя па паветах Палескага ваяводства за 1929 год: у Косаўскім павеце ў рамеснікаў-хрысціян налічвалася 95 майстэрняў, а ў рамеснікаў-яўрэяў – 272, у Пружанскім – адпаведна 10 і 227, Пінскім – 193 і 245, Драгічынскім – 39 і 256, Кобрынскім – 76 і 543, Камень-Кашырскім – 29 і 138, Столінскім – 211 і 949, Лунінецкім – 40 і 434, Сар-

ненскім – 74 і 464, Брэсцкім – 143 і 1027 [24, арк. 1 – 13зв.]. Рамеснікамі-яўрэямі былі манапалізаваны найбольш прыбытковыя спецыяльнасці. Яўрэі складалі большасць у Палескім ваяводстве сярод цесляроў, стэльмахаў, мяснікоў (80 %), пекараў (90 %), маляроў (96 %), сталяроў ($^5/_6$ ад агульнай колькасці) і муляроў (112 з 163 рамесных майстэрань). У Навагрудскім ваяводстве налічвалася больш за $^3/_4$ сталяроўяўрэяў, стэльмахаў, пекараў (93 %), мяснікоў (74 %), 47 з 74 мулярскіх рамесных майстэрань таксама належала яўрэям. У Беластоцкім ваяводстве з 27 токараў 26 – яўрэі, у Віленскім на 13 – 11 яўрэяў і Палескім – адпаведна з 17 – 16. У 1936 годзе ў Навагрудскім, Віленскім і Палескім ваяводствах на 100 майстроўяўрэяў па вырабу шапак прыходзіўся 1 рамеснік неяўрэйскай этнічнай прыналежнасці. Кавалі-яўрэі канцэнтраваліся галоўным чынам у Палескім (21 %), Беластоцкім і Навагрудскім (17 %) ваяводствах, у якіх яны складалі вышэй за $^2/_3$ ад агульнай колькасці рамеснікаў дадзенай спецыяльнасці. Пераважную большасць у шавецкім рамястве яўрэі займалі ў Палескім (86 %) і Беластоцкім (75 %) ваяводствах [10, с. 49 – 55]. Прыведзеныя дадзеныя яскрава сведчаць аб тым, што заходнебеларускае рамяство ў большай сваёй частцы канцэнтравалася ў руках яўрэяў.

Рамесныя вырабы, за невялікім выключэннем, рэалізоўваліся ў краіне, на мясцовых рынках. Практычна ўсе заходнебеларускія ганчарныя вырабы збываліся таксама на мясцовым рынку. Толькі вырабы мастацкай керамікі ішлі на продаж у іншыя рэгіёны Польшчы, часам за мяжу. Найбольш вядомым цэнтрам ганчарства на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гадах было мястэчка Гарадная Столінскага павета. Гарадная з’яўлялася адзіным цэнтрам вытворчасці белаглінянай керамікі ў Палескім ваяводстве [29, с. 97 – 98]. У мястэчку пражывала 219 сямей, якія займаліся ганчарствам [30, арк. 23]. Найбольш распаўсюджаным там быў выраб гаршкоў, місак, ваз, як звычайных, так і эмаліраваных (глазураваных пры дапамозе палівы). Эмаліраваныя вырабы былі больш якаснымі, аднак спосаб апрацоўкі керамічных вырабаў палівай быў не вельмі распаўсюджаны сярод гараднянскіх ганчароў. У мястэчку ім займаліся толькі 18 сямей. Галоўная прычына гэтага – дарагавізна матэрыялу, які ўжываўся пры вырабе палівы. Кошт такога матэрыялу, неабходнага для палівы аднаго воза (300 – 400 штук) гаршкоў, даходзіў да 15 злотых, пры тым што тавар аб’ёмам у адзін воз каштаваў 20 – 40 злотых у залежнасці ад яго якасці і колькасці. Таму не кожны сельскі ганчар быў у стане набыць матэрыял для выраба палівы. Тым больш што гатовыя гаршкі абменьвалі ў асноўным на збожжа (у сярэднім атрымлівалася 200 кг за воз), якое ішло на задавальненне патрэб ганчара і яго сям’і [30, арк. 15, 23]. Калі браць да ўвагі, што ўся сям’я працавала 6 тыдняў, каб вырабіць дадзены тавар, а потым столькі ж, каб яго прадаць, то можна ўявіць, колькі грошай за гэты час зарабляла сям’я ганчара.

Рамесніцкія спецыяльнасці будаўнічай групы залежалі ад будаўнічага руху. Працаўладкаванне на дадзеных спецыяльнасцях было высокім да канца 1928 года і было выклікана неабходнасцю аднаўлення знішчаных вайной мастоў, будынкаў, двароў і г.д. Пасля 1928 года назіралася моцнае зніжэнне будаўнічага руху. Будаўнічы крызіс асабліва адбіўся на рамястве печніка. Печнікі маглі знайсці заробак толькі пры будаўніцтве невялікіх прыватных дамоў, а таксама пры рамонтных працах. Тое ж назіралася і ў рамястве маляра. Больш за ўсё працы маляр знаходзіў пры будаўніцтве і рамонце храмаў, дзяржаўных, камунальных і ваенных будынкаў [22, с. 14; 31, с. 15].

Да самых шматлікіх спецыяльнасцей дрэваапрацоўчай групы адносіліся сталяры, цесляры і стэльмахі. Найбольш развіта з вышэйзгаданых рамёстваў на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства была мэблевая вытворчасць. У сувязі са зніжэннем коштаў у 1930 годзе на дуб і ясень зменшыліся кошты на мэблю і сталярскія вырабы ад 15 да 20 %. Аднак найбольш вялікае зніжэнне коштаў назіралася на хваёвую мэблю. Рамяство стэльмаха на тэрыторыі Заходняй Беларусі з кожным годам памяншалася і ў адносінах да ўсё больш набіраючай моц механізацыі на транспарце не мела спрыяльных умоў для свайго развіцця [22, с. 15; 31, с. 15]. У прафесіі бондара колькасць выпускаемай прадукцыі не намнога паменшылася (Беластоцкае ваяводства). Асноўная прычына – малаважная розніца ў коштах на фабрычныя і самаробныя бочкі, а таксама высокая якасць самаробных бочак у адрозненне ад машыннага браку. Дзякуючы развіццю дрэваапрацоўчай прамысловасці рамяство токара да сярэдзіны 1930 года ўзмацніла свае пазіцыі. Змянілася і становішча скульптараў, якія знаходзілі працу пры замовах на выкананне алтароў у адбудаваных касцёлах (Беластоцкае ваяводства). Асноўнымі вырабамі майстра музычных інструментаў былі піяніна, гітары, балалайкі, мандаліны і т.п. Галоўным цэнтрам вытворчасці музычных інструментаў з’яўлялася Віленскае ваяводства, там знаходзілася 7 прадпрыемстваў па вырабу музычных інструментаў: 1 – у Дзісненскім павеце; 4 – у Вілейскім, 2 – у самой Вільні. На тэрыторыі Беластоцкага ваяводства знаходзілася невялікая колькасць майстэрняў па вытворчасці духавых інструментаў, а таксама піянін (Беласток) і арганаў (Ломжа) [22, с. 15; 31, с. 15].

У тэкстыльнай групе найбольш развітымі былі кравецкае і шавецкае рамяство. Астатнія рамесніцкія спецыяльнасці былі нешматлікімі і не мелі вялікага гаспадарчага значэння ў дадзенай групе. У кравецкай вытворчасці ў 1930 годзе назіраўся невялікі спад. Гэта было выклікана, па-першае, зніжэннем пакупной здольнасці як сельскага, так і гарадскога насельніцтва; па-другое, вялікай канкурэнцыяй з боку фабрычнай вытворчасці, якая пастаўляла на мясцовыя рынкі вялікую колькасць нізкаякаснай прадукцыі. Канкурэнцыю краўцам складалі і «надомшчыкі», якія працавалі ва ўладальнікаў буйных крамаў вопраткі.

Самая высокая дзённая аплата ў дадзеным рамястве складала 8 злотых. Аднак вельмі часта кліенты плацілі ў растэрміноўку. Атэлье па пашыву моднага адзення, якія карысталіся замежнымі матэрыяламі, на заходнебеларускіх землях у 1930-х гадах прыйшлі ў заняпад, бо з-за хутка зменлівай моды не паспявалі выкарыстоўваць набытыя тканіны. Вялікую канкурэнцыю ім складалі мадысткі, якія працавалі нелегальна ў прыватных дамах. У шавецкім рамястве быў попыт толькі на гатовыя вырабы [22, с. 15 – 17; 31, с. 15].

У рамястве бляхароў аб’ём працы з кожным годам звужаўся. Бляхары маглі знайсці сабе працу толькі ў будаўніцтве. А ў выніку застою ў будаўнічым руху расло беспрацоўе, якое ў 1930 годзе вагалася ў межах ад 60 да 80 %. Працаўладкавацца бляхарам на будаўніцтве можна было толькі ў летні перыяд, узімку рамеснікі гэтай прафесіі займаліся вытворчасцю ўласнай прадукцыі. Канкурэнцыю ім складала фабрычная прамысловасць. Цана на прадукцыю бляхароў у 1930 годзе знізілася на 70 %. Гравёры, ювеліры, залатых і бронзавых спраў майстры і майстры, якія выраблялі ўпрыгожванні з залатых і срэбных дроцікаў, не былі шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Рамесніцкія спецыяльнасці, якія выраблялі прадметы раскошы, былі абмежаваны па колькасці выпускаемай прадукцыі. Колькасць прадукцыі ў ювелірнай прамысловасці звалілася ў 1930 годзе ад 50 да 70 % пры адначасовым спадзе кошту на срэбра. Збыт вырабаў з залатых і срэбных дроцікаў паменшыўся ад 30 да 35 %. На тэрыторыі Беластока адчувалася моцная канкурэнцыя з боку аналагічных вырабаў, якія прывозіліся з Варшавы [22, с. 16 – 18; 31, с. 16].

Больш усяго было развіта гарбарнае рамяство, якое перапрацоўвала толькі на тэрыторыі Віленскага ваяводства 16,9 % мясцовай скуры і 83,1 % імпартуемай. Заходнебеларуская скура экспартавалася ў Галандыю, Германію, Чэхію і Югаславію.

**Заключэнне.** У даследуемы перыяд у Польшчы была распрацавана даволі грунтоўная заканадаўчая база, якая была накіравана на рэгуляванне ўсіх сфер дзейнасці рамяства і рамеснай вытворчасці. Заканадаўчыя акты падрабязна адлюстроўвалі пытанні дзейнасці рамесніцкіх арганізацый і аб’яднанняў. Па прынятых законах ажыццяўлялася кіраўніцтва дзейнасцю рамеснікаў і кантроль за рамеснай вытворчасцю. На заканадаўчым узроўні былі ўнармаваны адносіны дзяржаўных органаў кіравання да рамяства і рамеснай вытворчасці. Дзякуючы прынятым законам была наладжана арганізацыя прафесійнага навучання практычна па ўсіх відах рамяства.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі рамяство развівалася даволі слаба. На такое становішча паўплывала шмат фактараў: складаная працэдура атрымання рамеснай карты – галоўнай умовы легальнага вядзення рамяства, таму на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічвалася вялікая колькасць рамеснікаў, якія вялі сваё рамяство без дазволу (толькі ў 1929 – 1930 гадах на 4 павета Палескага ваяводства даводзілася 2096 рамеснікаў, якія мелі рамесныя карты і 611, якія займаліся рамяством без рамесных карт); слабае тэхнічнае абсталяванне рамесных майстэрань; ручны спосаб вытворчасці; павелічэнне кошту працы; нізкі тэхнічны ўзровень прадукцыі; слабая арганізацыя гандлёвага збыту; цяжкасці, часта заснаваныя на немагчымасці адсочвання зменлівых фактараў эканамічнай кан’юнктуры; абмежаваная палітыка польскай улады ў дачыненні да рамяства. Найбольш распаўсюджанымі рамесніцкімі спецыяльнасцямі на заходнебеларускіх землях былі спецыяльнасці, звязаныя ў асноўным з выкарыстаннем таннай мясцовай сыравіны. Гэта спецыяльнасці групы апрацоўкі скуры, металу, дрэва, тэкстыльнай і сферы паслуг. Сярод іх былі сталяры, цесляры, слесары, бондары, токары, краўцы, шаўцы, кавалі, гарбары. Рамесная вытворчасць Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гадах была ў асноўным накіравана на задавальненне патрэб мясцовага насельніцтва, і ў першую чаргу сельскага, толькі нязначная частка рамесных вырабаў ішла на продаж за мяжу. У сувязі з тым, што плацёжаздольнасць сельскага насельніцтва была нізкай, рамеснікі атрымлівалі невялікі даход. Такое даволі цяжкае становішча заходнебеларускіх рамеснікаў і рамеснай вытворчасці пагаршалі і такія неспрыяльныя ўмовы, як канкурэнцыя з боку фабрычна-завадской прамысловасці, застой будаўнічага руху, павелічэнне колькасці прадукцыі, выраблямай батракамі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В.А. Лабачэўская. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 375 с.
2. Каспяровіч, Г.І. Промыслы і рамёствы беларусаў у XX ст. / Г.І. Каспяровіч, В.А. Каспяровіч // Весці Акадэміі навук Беларусі (серыя гуманітарных навук). – 1995. – № 3. – С. 105 – 113.
3. Orynżyna, J. Przemysł ludowy w województwach: wileńskim, nowogródzkim, poleskim, wołyńskim / J. Orynżyna. – Warszawa, 1927. – 46 s.
4. Orynżyna, J. Przemysł ludowy w Polsce / J. Orynżyna. – Warszawa, 1937. – 323 s.
5. Orynżyna, J. Przemysł ludowy w województwach wschodnich / J. Orynżyna // Rocznik Ziem Wschodnich. Kalendarz za rok 1937. – Warszawa, 1936. – S. 66 – 84.
6. Korybutiak, Z. Kawalstwa ludowe w województwe Wileńskiem / Z. Korybutiak. – Wilno, 1936. – 39 s.
7. Turkowski, L. Ludowa wytwórczość rzemieslnicza w [województwach] Wileńskiem i Nowogródzkiem / L. Turkowski. – Wilno, 1935. – 32 s.

8. Turkowski, L. Żrodło oddziaływań na tkactwo ludowe w Wileńskiem i Nowogródzkiem / L. Turkowski. – Londyn, 1977. – 35 s.
9. Turkowski, L. Tkactwo ludowe a rzemiosło tkackie w Wileńskiem i Nowogródzkiem / L. Turkowski // Rocznik Muzeum Narodowe Rolnictwa w Szreniawie. T. 14. – Pożnań, 1984. – 151 s.
10. Bornstein, I. Rzemiosło żydowskie w Polsce / I. Bornstein. – Warszawa: Nakładem Instytutu Badań Spraw Norodościowych, 1936. – 189 s.
11. Dynowski, W. Sztuka ludowa Wileńszczyzny i Nowogródczyzny / W. Dynowski. – Wilno, 1935. – 40 s.
12. Trzebińska-Bodzińska, H. Sztuka ludowa Wileńszczyzny i Nowogródczyzny a szkoła / H. Trzebińska-Bodzińska. – Wilno, 1937. – 36 s.
13. Gałasiewicz, S. Ziemia Nowogródska. Najpilniejsze gospodarcze i kulturalne potrzeby / S. Gałasiewicz. – Nowogródek, 1936. – 73 s.
14. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 7 czerwca 1927 r. «O prawie przemysłowem» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 53. – Poz. 468. – S. 697 – 720.
15. Ziemie polnocno-wschodnie Rzeczypospolitej / red. Jozef Swiecicki. – Wilno, 1933. – 68 s.
16. Ustawa z dnia 10 marca 1934 r. «O zmianie rosporządzenia Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 7 czerwca 1927 r. o prawie przemysłowem» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 40. – Poz. 350. – S. 686 – 694.
17. Rozporządzenie Ministra przemysłu i handlu z dnia 21 marca 1933 r. «O uzupełnieniu listy rzemiosł, zawartej w prawie przemysłowem» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 26. – Poz. 222. – S. 571 – 572.
18. Rozporządzenie Ministra przemysłu i handlu z dnia 23 czerwca 1936 r. «O uzupełnieniu listy rzemiosł» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 49. – Poz. 356. – S. 808.
19. Rozporządzenie Ministra przemysłu i handlu z dnia 20 lutego 1936 r. «O cechach rzemieślniczych» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 16. – Poz. 147. – S. 294 – 297.
20. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 27 października 1933 r. «O Izbach rzemieślniczych i ich związku» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 85. – Poz. 638. – S. 1627 – 1631.
21. Rozporządzenie Ministra przemysłu i handlu z dnia 16 lutego 1934 r. «O ordynacji wyborczej do Izb rzemieślniczych» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – № 19. – Poz. 157. – S. 311 – 317.
22. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Białymstoku o stanie gospodarczym rzemiosła w roku 1930-ym. – Białystok, 1931. – 44 s.
23. Государственный архив Брестской области (ГАБО) – Фонд 1. – Оп. 1. – Д. 761. Сведения о состоянии кустарных ремёсел и промышленности на территории Полесского воеводства за 1933 г.
24. ГАБО – Фонд 1. – Оп. 1. – Д. 760. Сведения о количестве ремесленников по поветам за 1929 г.
25. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 1. – Д. 811. Списки кустарей Полесского воеводства.
26. ГАБО. – Фонд 1 – Оп. 2. – Д. 3570. Решения полесского воеводы, заявления, переписка с поветовыми староствами и др. о выдаче патентов на занятие ремеслами.
27. ГАБО. – Фонд 1 – Оп. 2. – Д. 3573. Решения полесского воеводы, заявления граждан и переписка с поветовыми староствами и др. о выдаче патентов на занятие ремеслами.
28. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 2. – Д. 3574. Решения полесского воеводы, заявления граждан и переписка с поветовыми староствами и др. о выдаче патентов гражданам на занятие ремеслами.
29. Marczak, M. Pzewodnik po Polesiu / M. Marzak. – Brześć, 1935. – 156 с.
30. ГАБО. – Фонд 1. – Оп. 1. – Д. 443. Переписка со Столинским поветовым староством, Брестской ремесленной палатой об организации и ведении ремёсел: гончарного и кирпичного в Городной, сапожного в Давид-Городке.
31. Wilno i województwo Wileńskie. Informator społeczno-gospodarczy i księga adresowa m. Wilna i województwa Wileńskiego / pod. red. P. Krasnopolskiego. – Wilno, 1937. – 82 s.


*Паступiў 06.08.2012*

## THE DEVELOPMENT OF HANDICRAFT AND CRAFT INDUSTRY IN WESTERN BELARUS IN 1921 – 1939

***L. LAVREENKO***

*The article is devoted to the development of handicraft and craft industry in Western Belarus in 1921 – 1939. The research is built on numerous historic and archival documents. The author analyzes handicraft legislature of 1920 – 1930, particularly handicraft acts that regulated the main aspects of handicraft and craft industry in Western Belarus in 1921 – 1939, gives a detailed description of handicraft and craft industry conditions in Western Belarus in 1921 – 1939, characterizes the most developed handicrafts in Western Belarus. It's stated that handicraft in Western Belarus in 1921 – 1939 had transitional form (between cottage craft and factory industry) and was poorly developed. The majority of manufactured goods were aimed at local market.*